***Чудзікава А. В.**, выхавацель групы падоўжанага дня гімназіі № 1 г. Горкі Магілёўскай вобласці*

# Сваімі словамі

## Інтэлектуальная віктарына для IV класа

***Мэта:*** фарміраваць у вучняў патрыятычную самасвядомасць і грамадзянскую культуру праз павагу да роднай мовы.

***Задачы:***

- абагульніць и сістэматызаваць веды пра Беларусь;
- развіваць пазнавальныя інтарэсы, ўменне правільна будаваць свой адказ;
- узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў; развіваць навыкі актыўнага моўнага маўлення.
- выхоўваць пачуцце сяброўства, узаемадапамогі і падтрымкі.

***Абсталяванне:*** мультымедыйная прэзентацыя, інтэрактыўная дошка, лісты з назвамі каманд, аркушы са словамі, партрэты пісьменнікаў, крыжаванкі для кожнай каманды.

**1. Арганізацыйны этап.**

***Слайд 2.***

Мова…
Родная мова
У марах, у песнях, у снах.
Мае ў ёй кожнае слова
Свой колер і смак, і пах.
Зліваюцца гукі ў словы
І ў рэчышча роднай мовы,
Як рэкі у мора, цякуць.

І думкі мае плывуць
На хвалях і дзён, і начэй
Да сэрцаў людскіх і вачэй.

*Анатоль Грачанікаў*

— Сёння свае веды па беларускай мове і літаратуры будуць правяраць наступныя каманды: «Знаўцы» і «Эрудыты». Не бойцеся даваць адказы!

— Давайце пазнаемімся з умовамі першага тура. Пачынаем.

**II. Асноўны этап.**

**I тур**

— Каманды падбіраюць да пэўнага слова сваё, каб атрымалася словазлучэнне ці аснова сказа. Адказваеце па чарзе. За кожны правільны адказ — 10 балаў ***(слайд 3)***.

**Назоўнік + прыметнік:**

1) спадніца;
2) надвор'е;
3) папера;
4) гузік;
5) хлопчык;
6) настаўнік;
7) сабака;
8) печка;
9) вецер;
10) сонца.

**Прыметнік + назоўнік:**

1) прыгожы;
2) залаты;
3) старая;
4) вясёлая;
5) прыемны;

6) бацькаў;
7) блакітнае;
8) сардэчнае;
9) лёгкая;
10) светлая.

**Дзеяслоў + прыслоўе:**

1) гаварыць (як?);
2) рэзаць;
3) кінуць;
4) бегчы;
5) зіхаціць;
6) працуе.

— Першы этап пройдзены паспяхова. Мы працягваем.

**II тур**

— Удзельнікі тлумачаць сэнс «хітрых» беларускіх слоў — выбіраюць з чатырох варыянтаў адзін правільны. Адказы прымаюцца па чарзе. За кожны правільны адказ — 10 балаў ***(слайды 4−12)***.

1. Жывіца — гэта…

ежа смала сястра бялізна

2. Стромкі — гэта які?

высокі руплівы гучны памяркоўны

3. Цыдулка — гэта…

запіска цацка скрынка сукенка

4. Праснак — гэта…

блін прылада сонны чалавек дзённік

5. Кемны — гэта які?

чарнявы несур'ёзны прыгожы разумны

6. Камора. Што ў ёй можна рабіць?

вучыцца гандляваць захоўваць лячыцца

7. Чупрына — гэта…

адзенне <u>валасы</u> дрэва тканіна

8. Цырульня. Што ў ёй можна рабіць?

гандляваць захоўваць <u>стрыгчыся</u> лячыцца

— Малайцы! Народныя выразы яскравыя і вобразныя. Узбагаціць імі сучаснае маўленне дапаможа наступны конкурс. Слухаем умовы.

**III тур**

— Вам патрэбна вызначаюць правільнае тлумачэнне фразеалагічных выразаў. Адказваеце па чарзе. За кожны правільны адказ — 10 балаў ***(слайды 13−14)***.

1. Пашыцца ў дурні — пацярпець няўдачу.
2. Выкінуць каленца — зрабіць недарэчнае.
3. Падмазаць пяткі — уцячы.
4. Гарадзіць плот — гаварыць абы-што.
5. Біць тылылы — гультайнічаць.
6. Вастрыць зубы — рыхтаваць непрыемнасць.
7. Даваць дразда — рабіць нешта неверагоднае.
8. Што ёсць духу — хутка бегчы.
9. Як жару ўхапіўшы — вельмі хутка.
10. Плюнуць некуды — вельмі шмат.

— Вельмі добра! Разумець адзін аднаго моўчкі — талент. А з паўслова — гэта старанне плюс інтуіцыя. Наступны тур.

**IV тур**

Гулец выцягвае прадмет і апісвае яго па-беларуску, не называючы яго, каб партнёр здагадаўся. На тлумачэнне кожнага малюнка — 10−15 секунд. Адказы прымаюцца па чарзе. За кожны правільны адказ — 20 балаў ***(слайд 15)***.

<u>Словы:</u> бульба, яблык, цукерка, бусел, карагод, лаўка, верш, вуліца, карова, дранік, лыжка, вада.

— Мы пераходзім да наступнага этапу.

**V тур**

— Каманды павінны суаднесці партрэт пісьменніка і яго імя. Колькасць балаў залежыць ад колькасці правільных адказаў ***(слайд 16−17)***.

Янка Купала

Якуб Колас

Максім Багдановіч

Францыск Скарына

**VI тур**

— Вось і наступіў фінальны этап гульні. У ім вам спатрэбіцца рашучасць і вытрымка адначасова. Перад вамі крыжаванка, якую вы мусіце запоўніць адказамі. Невялікая заўвага: дыграфы ***дж*** і ***дз*** пішуцца ў дзве клетачкі. Адказваеце па чарзе. За кожны правільны адказ — 10 балаў ***(слайд 18)***.

1. Нішто не ляцела,
нішто не спужала,
А ўся затрымцела,
А ўся задрыжала. *(Асіна.)*
2. У народных паданнях: лясны дух, гаспадар лесу і звяроў. *(Лесавік.)*
3. Рана ў поле выязджай,
Будзе добры... *(Ураджай.)*
4. Трэці летні месяц. *(Жнівень.)*
5. Заснавальнікам гэтага горада завуць легендарнага Машэку. *(Магілёў.)*
6. Словы, якія адказваюць на пытанні *хто? што?* і абазначаюць прадмет. *(Назоўнік.)*
7. На колькі абласцей падзяляецца Рэспубліка Беларусь? *(Шэсць.)*
8. Як называецца дзень, якім заканчваецца тыдзень? *(Нядзеля.)*
9. Па-руску — стыд, а па-беларуску... *(Сорам.)*
10. Сакавік, красавік, май — гэта... *(Вясна.)*
11. Лялькі, кубікі, мячы — гэта... *(Цацкі.)*

12. У XX ст. у Беларусі галоўным героем навагодніх святаў стаў гэты дзед. *(Мароз.)*



**III. Заключны этап.**

— Віктарына завяршаецца. Сення ў нас першай стала каманда…

Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія. ***(Слайд 20.)***